**А. Халупка**

# ЗВАНАМ ХАТЫНІ ГУЧАЦЬ

Веданне ваеннай гісторыі Беларусі – найважнейшая задача, таму што без памяці пра мінулае ў нас няма будучыні. Штогод мы ўсё больш аддаляемся ад хатынскай трагедыі. Мы, дзеці XXI стагоддзя, не ўсведамляем сабе ўсіх жахаў вайны, не ведаем болю страт, не ўяўляем сабе полымя, якім палыхала беларуская вёска Хатынь.

Але хто ж не ведае гэтай трагедыі? Назва беларускай вескі стала яе сімвалам. Паводле дакументаў 22 сакавіка 1943 г. карнікі акружылі веску ў 26 двароў. Усіх жахароў вёскі, дзяцей, жанчын, пажылых людзей, выганялі з хат і зганялі ў адзін з хлявоў. Затым зачынілі дзверы і падпалілі ў некалькіх месцах. У час, калі хлеў палымнеў агнём, вароты адчынілі. Людзей, якія ратаваліся з полымя, пачалі расстрэльваць з кулямёта. Сто сорак дзевяць чалавек загінулі ў агні. Хатынская зямля пачарнела ад попелу і крыві, здрыганулася ад людскіх пакут.

Хатынь захоўвае ў сабе памяць аб тых, хто загінуў ад фашысцкіх рук. Мемарыяльны комплекс часта параўноўваюць з кнігай: кожная частка комплекса – асобная старонка Вялікай Айчыннай вайны. Агляд яго бярэ свой пачатак ад сімвалічнага тыну. Некалі тут пачыналася вёска, тут сустракалі гасцей, ладзіліся вясельныя абрады. На мемарыяльных плітах застылага ў бетоне тыну – лічбы страт Беларусі ў гады вайны.

Як сведчаць лічбы, Вялікая Айчынная вайна забрала кожнага чацвёртага, а згубіла людскія лёсы і пакінула глыбокі след у сэрцах тых, каму давялося жыць у гэты страшны час. На тэрыторыі Беларусі лёс Хатыні зведалі яшчэ 185 беларускіх вёсак. Тут жа можна ўбачыць дваццаць шэсць абеліскаў у выглядзе пячных комінаў (на версе якіх знаходзяцца званы, якія сінхронна б'юць, прыблізна раз у мінуту), што сімвалізуюць спаленыя хаты Хатыні, «Сцяну памяці» – помнік тым, хто быў замучаны ў канцлагерах і гета, скульптуру «Непакораны чалавек» – сімвал жыхара, якому давялося выжыць, каб убачыць, як памірае яго сын.

Нам трэба заўсёды памятаць пра вайну. Мне ўсяго васямнаццаць, аднак я магу нямала расказаць пра гэтыя страшныя гады, бо шмат чула пра іх, пра тых, хто іх перажыў. Я прачытала шмат мастацкіх твораў і навуковых тэкстаў, прысвечаных Вялікай Айчынай вайне, праслухала шмат экскурсій, размаўляла з ветэранамі... Аднак ніколі не здолела ў поўнай меры адчуць тое, што зведалі тыя людзі, якія гатовы былі аддаць усё для нашага светлага і шчаслівага будучага. За гэта неабходна сказаць ім вялікі «дзякуй», памятаць пра іх – гэта тое, што кожны з нас, маладых, здольны зрабіць сёння.

Будзем памятаваць пра Хатынь, нязмерны людскі боль, неймаверныя страты, панесеныя на беларускай зямлі.